Пролетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблвыканкома.

Год выдання другі.

№ 47 (116)
АЎТОРАК
27
ЛЮТАГА
1940 г.

Цана 10 капеек

КАНДЫДАТЫ БЛОКА КОМУНІСТАЎ І БЕСПАРТЫЙНЫХ

У апошніх нумарах нашай газеты надрукаваны падрабязныя біяграфічныя нарысы кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР Сяргея Осіпавіча Прытыцкага і Марыі Іванаўны Дз'ячук. Сёння мы друкуем біяграфічны нарыс аб ветэрану грамадзянскай вайны, тройчы ордэнаносцу камандарму 2-га ранга Міхаіле Пракоф'евічу Кавалёве. У чарговых нумарах будуць друкавацца нарысы і аб другіх кандыдатах у дэпутаты Вярхоўных Советаў СССР і БССР.

Кожны чытач, які азнаёміцца з гэтымі матэрыяламі, упэўніцца, што народ вылучыў кандыдатамі ў дэпутаты вярхоўных органаў улады самых дастойных сваіх сыноў і дачок. Гэта людзі, якія ўсё сваё жыццё прысвяцілі вызваленню працоўных ад ланцугоў рабства і эксплаатацыі. Гэта людзі, якія не шкадавалі сваіх сіл, рызыкуючы сваім жыццём, змагаліся з класам гвалтаўнікоў і рабаўнікоў. Гэта людзі, якія і надалей будуць верны свайму народу, будуць абараняць яго інтарэсы.

Цікава прывесці некаторыя параўнальныя даныя, якія характарызуюць састаў вылучаных кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўных Советаў ад нашай вобласці з дэпутатамі сейма былой польскай дзяржавы. Сейм складаўся з 71 землеўласніка (памешчыкі і кулакі), 11 фабрыкантаў і гандляроў, 3 рамесленікаў, 15 пасадных асоб, 3 афіцэраў, 4 свяшчэнікаў 14 адвакатаў і натарыусаў, 10 буржуазных журналістаў і пісьменнікаў.

У сейме, як бачым, не было ні аднаго рабочага, ні аднаго беднага або сярэдняга селяніна.

Звернемся да даных, якія характарызуюць састаў кандыдатаў у дэпутаты па нашай вобласці. Сярод іх 12 рабочых, 30 сялян і 16 прадстаўнікоў інтэлігенцыі. Сярод кандыдатаў —45 мужчын і 13 жанчын.

Састаў польскага сейма адлюстроўваў нацыянальны прыгнёт, які панаваў у былой Польшчы. У сейме не было ні аднаго беларуса. Яўрэйскае насельніцтва ўсёй Польшчы было прадстаўлена чатырма дэпутатамі, якія, безумоўна, нічога агульнага не мелі з працоўнымі масамі. Гэтыя чатыры дэпутаты былі: фабрыкант з Лодзі, купец з Варшавы, рабін і адвакат з Львова.

У саставе кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўных Советаў СССР і БССР ад нашай вобласці мы бачым палову беларусаў, 16 палякаў, 6 рускіх, 2 яўрэі і іншыя нацыянальнасці. Гэтыя лічбы адлюстроўваюць сталінскую нацыянальную палітыку і брацтва народаў, якое вастаржаствавала на вызваленай зямлі.

Мы зараз знаходзімся на самым адказным этапе выбарчай кампаніі. Нашы агітатары павінны ахапіць сваёй агітацыяй кожнага выбаршчыка, расказаць яму падрабязную біяграфію, увесь жыццёвы шлях кандыдата, за якога ён будзе галасаваць. Праўдзівы расказ аб нашых кандыдатах выкліча вялікі палітычны ўздым сярод выбаршчыкаў. Вялікай радасцю напоўняцца сэрцы рабочых, сялян і працоўнай інтэлігенцыі, калі яны ўпэўняцца, што ў вярхоўныя органы ўлады вылучаны толькі прадстаўнікі рабочых, сялян і інтэлігенцыі. Сярод дэпутатаў няма ні аднаго памешчыка і капіталіста, ні аднаго гандляра і біржавіка, ні аднаго кулака ці асадніка. У Бельскім раёне ў адной вёсцы група кулакоў імкнулася проціпаставіць кандыдату блока комуністаў і беспартыйных свайго падгалоска. Арганізатарам выстаўлення гэтага кандыдата аказаўся кулак, які мае 5 коней, 8 кароў і 30 га зямлі. Працоўныя сяляне выкрылі гэтых кулакоў і адвялі іх стаўленіка. Няма і не можа быць месца ў соцыялістычным парламенце ворагам працоўнага народа. Працоўныя масы падводзяць гістарычны рахунак са сваімі прыгнятальнікамі і эксплаататарамі.

Але ворагі сваю зброю не складаюць. Яны будуць імкнуцца шляхам паклёпаў і правакацый апарочыць хоць чым-небудзь кандыдатаў народа. Але калі нашы агітатары падрабязна раскажуць біяграфіі кандыдатаў усёй масе выбаршчыкаў, то самі выбаршчыкі выкрыюць паклёпнікаў і правакатараў, усіх агентаў англа-французскіх падпальшчыкаў вайны і дружна, арганізавана аддадуць свае галасы кандыдатам блока комуністаў і беспартыйных.

Галасуючы за сваіх кандыдатаў, народ будзе галасаваць за сваю любімую радзіму, за яе магутнасць і працвітанне, за партыю Леніна—Сталіна, якая не ведае іншых інтарэсаў, чым інтарэсы свайго народа; за свайго бацьку і друга, за свайго вызваліцеля любімага Сталіна.

—«о»—

АПЕРЗВОДКА ШТАБА ЛЕНІНГРАДСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

На працягу 25 лютага на Карэльскім перашэйку нашы часці, перамагаючы ўмацаванні праціўніка, занялі 28 абаронных умацаваных пунктаў, з іх 8 жалезабетонных артылерыйскіх збудаванняў. Неаднаразовыя спробы праціўніка контратакаваць нашы часці адбіты з вялікімі для яго стратамі.

На другіх участках фронта не адбылося нічога істотнага.

Наша авіяцыя правяла ў радзе раёнаў паспяховую бамбардыроўку войск праціўніка. У паветраных баях збіта 10 самалётаў праціўніка.

РЭГІСТРАЦЫЯ КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНЫХ СОВЕТАЎ СССР і БССР

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ВАЛКАВЫСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 601

Аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР

Сеўко Паўла Антонавіча

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР і ўстанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. 61 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўныя Советы СССР», акруговая выбарчая камісія ПАСТАНАЎЛЯЕ:

У адпаведнасці з арт. 60 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР», зарэгістраваць для балатыроўкі па Валкавыскай выбарчай акрузе № 601, вылучаную агульнымі сходамі членаў профсаюза пачатковых і сярэдніх школ і дзяржустаноў гор. Саколка, рабочых скурзавода № 19, сялян вёскі Сакаляны, Саколкаўскага раёна, сялян Мсцібаўскага сельсовета і радам іншых сходаў, падтрыманую акруговай прадвыбарчай нарадай упаўнаважаных 5 раёнаў, кандыдатуру тав. Сеўко Паўла Антонавіча, 1907 года нараджэння, беспартыйнага селяніна, працуючага старшынёй Мсцібаўскага сельсовета, пражываючага ў вёсцы Андрэеўцы, Мсцібаўскай воласці.

На падставе арт. 66 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР», уключыць кандыдатуру Сеўко П. А. у выбарчы бюлетэнь па Валкавыскай выбарчай акрузе № 601.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі СМІРНОЎ
Намеснік старшыні БІЧЫХІН
Сакратар камісіі РАХЛІН
Члены: КАЗЕЙКО, АЎСЕЙЧЫК, ЧУРЫК, КІШКІН, ПАРЭМСКАЯ, ПРЫТЫЦКАЯ.

Гор. Валкавыск, 22 лютага 1940 г.

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ГРОДНЕНСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 600

Аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР

Пестрака Філіпа Сямёнавіча

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР і ўстанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. 61 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР», акруговая выбарчая камісія ПАСТАНАЎЛЯЕ:

У адпаведнасці з арт. 60 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР», зарэгістраваць для балатыроўкі па Гродненскай выбарчай акрузе № 600 вылучаную агульным сходам работнікаў асветы гор. Гродна, на якім прысутнічала 450 чалавек; сходам рабочых і служачых чыгуначнага вузла Гродна, на якім прысутнічала 360 чалавек, і радам іншых сходаў, падтрыманую акруговай прадвыбарчай нарадай упаўнаважаных, на якой прысутнічала 197 чалавек, кандыдатуру тав. Пестрака Філіпа Сяменавіча, 1903 года нараджэння, беспартыйнага, працуючага ў рэдакцыі газеты «Свабодная Беларусь», пражываючага ў гор. Гродна.

На падставе арт. 66 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР», уключыць кандыдатуру Пестрака Ф. С. ў выбарчы бюлетэнь па Гродненскай выбарчай акрузе № 600.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі БУГРОЎ
Намеснік старшыні КАРПЕНЮК
Сакратар камісіі ГАЛІЛАВА
Члены: ЦЕРАХАЎ, ШТЭЙНБАХ, ПІМЕНАВА.

Гор. Гродна, 22 лютага 1940 г.

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ЧЫГУНАЧНАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 356

Аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР

Вайцэшука Пятра Кірылавіча

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР і ўстанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. 53 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», акруговая выбарчая камісія ПАСТАНАЎЛЯЕ:

У адпаведнасці з арт. 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», зарэгістраваць для балатыроўкі па Чыгуначнай выбарчай акрузе № 356 вылучаную агульным сходам рабочых, інжынераў, тэхнікаў і служачых Упраўлення чыгункі Беластоцкага чыгуначнага вузла, на якім прысутнічала 1500 чалавек, падтрыманую акруговай прадвыбарчай нарадай, кандыдатуру Вайцэшука Пятра Кірылавіча, 1906 года нараджэння, беспартыйнага, загадчыка бытавым аддзелам Дорпрофсожа, пражываючага ў гор. Беластоку.

На падставе арт. 56 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», уключыць кандыдатуру тав. Вайцэшука П. К. ў выбарчы бюлетэнь па Чыгуначнай выбарчай акрузе № 356.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі М. ГАРБУНОВА
Намеснік старшыні ШПАГІН
Сакратар камісіі БЫСТРОВА
Члены: АНДРУШКЕВІЧ, БЕРТАВА, ВІЛЬКОШЫНСКІ

Гор. Беласток, 23 лютага 1940 г.

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ КОЛЬНАЎСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 329

Аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР

Сямёнава Гаўрыіла Іванавіча

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР і ўстанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. 53 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», акруговая выбарчая камісія ПАСТАНАЎЛЯЕ:

У адпаведнасці з арт. 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», зарэгістраваць для балатыроўкі па Кольнаўскай выбарчай акрузе № 329 вылучаную агульным сходам грамадзян гор. Кольна, на якім прысутнічала 300 чалавек; сходам сялян вёскі Баркова, на якім прысутнічала 250 чалавек; падтрыманую акруговай прадвыбарчай нарадай, на якой прысутнічала 150 чалавек, кандыдатуру тав. Сямёнава Гаўрыіла Іванавіча, 1900 года нараджэння, члена КП(б)Б, сакратара па прапагандзе Беластоцкага абкома КП(б)Б, пражываючага ў гор. Беластоку.

На падставе арт. 56 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», уключыць кандыдатуру тав. Сямёнава Г. І. у выбарчы бюлетэнь па Кольнаўскай выбарчай акрузе № 329.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі ЛІТОШ
Сакратар камісіі КУКСА
Члены: СТАВІЦКІ, ВАСНІН, ПРУСІНСКАЯ, РЖАТКЕВІЧ

Гор. Кольна, 23 лютага 1940 г.

ПА СОВЕЦКАМУ САЮЗУ

РЭКОРД СТАХАНАЎЦА УШКАЛАВА

Брыгада знатнага стаханаўца кузні Маскоўскага аўтазавода ім. Сталіна дэпутата Маскоўскага гарадскога совета М. Ф. Ушкалава ў ноч на 22 лютага адштампавала за змену 1.039 каленчатых валаў пры новай норме ў 500 валаў.

НОВЫЯ МАРТЭНЫ

Магнітагорск. У новым сталеплавільным цэху Магнітагорскага металургічнага камбіната ім. Сталіна закончана кладка трэцяй мартэнаўскай печы. Укладзена каля двух тысяч кубаметраў агнетрывалай цэглы, сманціравана 1.700 тон металургічных канструкцый. Ванна печы разлічана на адначасовую садку 350 тон метала.

25 лютага печ будзе здана ў эксплаатацыю. Зараз пачата кладка чацвертай мартэнаўскай печы.

АГРАТЭХНІЧНАЯ ВУЧОБА КАЛГАСНІКАЎ

Уладзівасток. У прыморскім краі на курсах трактарыстаў займаецца 1.155 чалавек. 210 калгаснікаў рыхтуюцца стаць камбайнерамі. У калгасных агратэхнічных кружках абучаецца 1.013 брыгадзіраў і звеннявых. У садовай школе пры вопытнай плодагароднай станцыі займаецца 150 калгасных садаводаў.



На здымку: Д. Г. Леонаў, зоатэхнік соўгаса «Комунарка» (Краснапахарскага раёна, Маскоўскай вобласці) гутарыць з лепшымі даяркамі соўгаса Т. Г. Курылкінай і Е. І. Гету, якія надаілі за 11 месяцаў па 3.700 літраў малака на кожную фуражную карову. (Фота-клішэ ТАСС).

КАНАЛ ПА ПРАСКАВЕЙСКІХ ВІНАГРАДНІКАХ

Варашылаўск. Праскавейскія вінаграднікі славяцца далёка за прэдзеламі Орджанікідзеўскага края. У мінулым годзе яны займалі 1.142 гектары. Цяпер пад вінаград будзе адведзена яшчэ 400 гектараў. Для арашэння вінаграднікаў пачата збудаванне арашаючай сістэмы. 1-е красавіка аб'яўлена першым днём масавага выхаду калгаснікаў на будаўніцтва канала.

ПЕРАСЯЛЕНЦЫ ВА ЎСХОДНІЯ РАЁНЫ

Тамбоў. З Кірсанава накіраваўся на Усход першы ў гэтым годзе эшалон з перасяленцамі. Сярод 1.500 перасяленцаў, выехаўшых з Красінскага, Платонаўскага, Гаўрылаўскага, Кірсанаўскага і інш. раёнаў Тамбоўскай вобласці — каля 300 чалавек сем'яў калгаснікаў ужо ўстроіўшыхся ў многазямельных абласцях.

ДАПАМОГА МНОГАДЗЕТНЫМ МАЦЕРАМ

Баранавічы. У 1-м радзільным доме ў гр. К. І. Новак нарадзілася 12-е дзіця. Баранавіцкі абласны выканаўчы камітэт пастанавіў выдаць гр. Новак адначасовую дапамогу ў 2.000 рублёў і прапанаваў выканаўчаму камітэту прадставіць сям'і Новак добрую кватэру.

ПАЧАЛАСЯ ВЯСЕННЯЯ ПАХАТА

Ерэвань. Калгас ім. Шаумяна, Горыйскага раёна першы у Арменіі прыступіў да вясенняй пахаты. Брыгады вышлі ў поле ўпаўне падрыхтаванымі. У бліжэйшыя дні палявыя работы пачнуцца ў Іджеванскім, Кафанскім Шамшадзінскім раёнах. (ТАСС).

24 САКАВІКА ВЫБАРЫ Ў ВЯРХОЎНЫЯ СОВЕТЫ СССР І БССР

ВЫБАРШЧЫКІ 597 ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ ПА ВЫБАРАХ У СОВЕТ САЮЗА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР, УСЕ, ЯК АДЗІН, АДДАВАЙЦЕ СВАЕ ГАЛАСЫ ЗА ВЕРНАГА СЫНА БОЛЬШЭВІЦКАЙ ПАРТЫІ, ТРОЙЧЫ ОРДЭНАНОСЦА, МІХАІЛА ПРАКОФ'ЕВІЧА КАВАЛЁВА!

Міхаіл Пракоф'евіч Кавалёў

(БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС)

Калі на XVII з'ездзе КП(б) Беларусі кандыдатура Міхаіла Пракоф'евіча была вызначана для галасавання у састаў членаў ЦК КП(б)Б і ў часе абмеркавання яе ён расказваў сваю аўтабіяграфію, я зірнуў на гадзіннік: яго расказ заняў тры мінуты:

«Нарадзіўся ў 1897 годзе, у станіцы Брухавецкай, на Кубані. Бацька — сталяр. Сам да 1910 года вучыўся у пачатковай двухкласнай школе. Летам — дапамагаў бацьку, працаваў на малатарнях. У 1915 годзе пайшоў у царскую армію. У Чырвонай Арміі — з дня яе заснавання. Біўся супроць Карнілава, Дзенікіна, Врангеля, на Кубані, Тэрэку і ў Стаўропалі. Прайшоў астраханскія пяскі. Біўся з Антонавым. Тройчы ранен. Зараз камандую войскамі Беларускай Ваеннай Акругі».

Вось і усе, што ён расказаў аб сабе.

А вось толькі невялікая доля з таго, што стаіць за гэтымі скупымі словамі, тройчы ордэнаносца тав. Кавалёва, якога працоўныя Беластоцкай выбарчай акругі № 597 вылучылі сваім кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР.

I.

Люты 1917 года. Турэцкі фронт. Сюды, за снежныя хрыбты Каўказа, яшчэ не даляцелі грозныя парывы ўзнімаючайся рэвалюцыйнай навальніцы, але 22 лютага ў палку, дзе служыў тав. Кавалёў, успыхнуў «бунт». Даведзеныя да роспачы амаль трохгадовым кашмарам вайны, салдаты выгналі з палка афіцэраў і намецілі свае кандыдатуры на пасады камандзіраў. Адным з гэтых кандыдатаў быў М. П. Кавалёў.

У царскага камандавання яшчэ хапіла сіл на падаўленне гэтага «бунта». «Зачыншчыкі», арганізатары паўстання былі схоплены і кінуты ў турму. Кавалёву, нароўні з арыштаванымі арганізатарамі паўстання, пагражаў ваенна-палявы суд і пятля, але 3 сакавіка было атрымана паведамленне аб звяржэнні царызма. Арыштаваныя і Кавалёў апынуліся на свабодзе.

II.

Лістапад 1918 года. Часці Чырвонай Арміі, пакінуўшы Стаўропаль (цяпер Варашылаўск), адышлі на ўсход. З баямі адыходзіла і чырвонаармейская калона, якой камандаваў тав. Кавалёў.

Раніцою разведкай калоны Кавалёва быў захоплен врангелеўскі абоз. Ад аднаго з захопленых у палонураднікаў давдаліся, што конніца Врангеля заняла сяло Пятроўскае. Той-жа ўраднік паведаміў пароль і пропуск, якія дзейнічалі на працягу гэтых сутак у белагвардзейцаў.

І тав. Кавалёў рашыў ісці к штабу Врангеля, у сяло Канстанцінаўку, размешчанае кіламетрах у 40 ад лініі фронта. Па вестках, атрыманых усё ад таго-ж незадачлівага ўрадніка, у Канстанцінаўцы Врангель сканцэнтраваў 12 палкоў конніцы.

У пустым полі смутна выў марозны, да касцей пранізваючы вецер. Стаяла непраглядная лістападаўская ноч, калі атрад у 350 коннікаў, падабраны днём тав. Кавалёвым, рушыў на захад, везучы з сабою два кулямёты, гармату і акуратна ўкладзеныя ў зарадныя яшчыкі 50 снарадаў да яе. (Гэта ўсё, што мелі ўсе 5 палкоў, якімі камандаваў тав. Кавалёў).

Яшчэ перад выхадам былі зняты з папах чырвоныя ленты і звёзды, а з гімнасцёрак банты. Быць не пазнанымі да прыбыцця на месца — такая была бліжэйшая задача.

Ужо стала віднець, калі атрад падыходзіў да Канстанцінаўкі. Врангелеўская тылавая застава, ахоўваўшая подступы сяла з тылу, размяшчалася на млыне. З наступленнем раніцы вахмістр, камандаваўшы заставай, парашыў, што яго задача выканана, і увеў салдат у дом млына абагрэцца. Большасць замерзшых за ноч салдат ужо спала, калі ў хату ўляцеў тав. Кавалёў і нецярпячым пярэчання голасам патрабаваў да сябе начальніка тылавой заставы. Перапалоханы вахмістр, на-хаду засцегваючыся і адзергваючыся, з абалдзелым выглядам, далажыў тав. Кавалёву аб баявой задачы заставы. Врангелеўскі служака канчаткова разгубіўся, калі гэты грозны «начальнік» запытаў яго, дзе стаіць «сам Врангель».

Ён безнадзейна перапалохаўся і заікаючыся далажыў, што штаб «іх высокапрэвасхадзіцельства» знаходзіцца у школе, а само «высокапрэвасхадзіцельства» зрабіла ласку спыніцца ў мясцовага бацюшкі.

Сяло, да адмаўлення набітае войскамі, яшчэ спала. Пакінуўшы у рэзерве 100 чалавек коннікаў і гармату, тав. Кавалёў кулямёты паслаў на выхады сяла з боку фронта. Разлік быў просты: у паніцы к фронту уцякаць не стануць, рынуцца ў тыл. Агонь услед выкліча яшчэ большую паніку.

250 коннікаў тав. Кавалёў узяў з сабою. Гэту жменьку людзей ён разбіў на атрады ў 40—45 чалавек. Кожны з такіх атрадаў быў пушчан на шасці прадольных вуліцах сяла з задачай: па 2—3 чалавекі заязджаць ва двары, ціха, кінжалам і шашкай, без выстрала канчаць афіцэраў, а радавых канваіраваць к млыну. Сам Кавалёў з дзевяццю коннікамі рушыў да плошчы.

Дом папа хутка знайшлі. Поўсонныя вярзілы ў казачай вопратцы прадстаўлялі ганаровую варту. Пяць чалавек з сваей жменькі Кавалёў адправіў на штаб, а сам з трыма байцамі рушыў да дома папа — рэзідэнцыі Врангеля.

Трэба было спяшацца. Не даць ворагу разабрацца ў абстаноўцы, не даць апомніцца — у гэтым цяпер было галоўнае.

Чацвёрка падляцела да дома папа, на-хаду, пад буркамі, рыхтуючы гранаты к бою. Два акны на вуліцу аказаліся чамусьці адкрытымі. Два ўзрывы гранат рванулі ранішнюю цішыню.

Праз секунду па ўсяму велізарнаму сялу паднялася неўваабражальная паніка: пальба, узрывы гранат, стогны, крыкі людзей, іржанне, візг і храп коней — усё змяшалася ў суцэльным хаосе. Казачая варта ля папоўскага дома, якая нічога не паспела зразумець, палічыла за лепшае, кінуўшы вінтоўкі, пусціцца наўцёкі ўздоўж вуліцы.

Двое чырвонаармейцаў, суправаждаўшых тав. Кавалёва, уварваліся на папоўскі двор:

— Запрагай! — скамандавалі яны яшчэ няпоўнасцю прачнуўшамуся саставу асабовай варты Врангеля, якая бесталкова мітусілася па двару. Нічога не разумеючы, салдаты наспех запрагалі і сядлалі коней і ва ўвесь кар'ер, падганяемыя чырвонаармейцамі, імчаліся да млына. Прыкладна тое-ж адбывалася на ўсіх іншых дварах. У врангелеўцаў усё пераблыталася. Ніхто нічога не разумеў, і адзіныя ў гэтай бесталачы ўладарныя галасы чырвонаармейцаў, якіх нікому не прыходзіла ў галаву лічыць за чырвоных, падначальвалі сябе волю тысяч ашалеўшых людзей. Па вуліцы імчаліся, чапляючыся адна за другую, гарматы, тачанкі, зарадныя яшчыкі, патронныя двуколкі, санітарныя фурманкі, коннікі, часта босыя і ў ніжняй бялізне.

А ў гэты час у доме папа адбывалася наступнае: першым у дом уляцеў, трымаючы напагатове гранату, тав. Кавалёў. Дошкі на падлозе папоўскай гасцінай разварочаны ўзрывам. На парозе—забіты. Гэтакая нікалаеўская бародка. Яўна генерал. (У твар Врангеля ні Кавалёў, ні яго таварыш не ведалі).



— Врангеля стукнула, таварыш камандзір!

У спальні на падлозе валялася чаркеска, бурка, скрынка асабістых рэчаў барона. (Тады, між іншым, быў захоплен паслужны спіс Врангеля).

Па ўсіх прыметах—Врангель забіт.

У той час у двары раздаўся дзікі жаночы піск. Тав. Кавалёў выскачыў на ганак. Перад яго вачыма ўстала такая карціна: адзін з чырвонаармейцаў-коннікаў, на гарцуючым кані, памахваючы шабляй, некалькі збянтэжана, баском, угаварваў жанчыну, якая, як звар'яцелая, кідалася па двары ў адзінай батыставай сарочцы.

— Чаго ты гарланіш, дамачка? Сядзь і сядзі спакойна. Вашага саслоўя ніхто не кране, толькі бегаць кінь, а то, між іншым, я вельмі проста прыстрэліць магу, калі паніку наводзіць будзеш.

Насілу ўдалося супакоіць гэтую «сястру міласэрдыя», якая аказалася чарговай «паходнай жонкай» Врангеля. Яе прывялі ў дом. Ужо гэта, напэўна, Врангеля ведае. Паказваючы на труп забітага генерала, адзін з чырвонаармейцаў запытаў:

— Гэта і ёсць Врангель, дамачка?

Пытанне было пастаўлена яўна няўдала. Кавалёў дакорліва зірнуў на пытаўшага. Жанчына мігам ускінула вочы на байцоў, але ўжо ў наступную секунду, сцвярджальна кіўнуўшы галавою, адказала:

— Так,—і зноў дзіка загаласіла.

Врангель або не Врангель— доўга разбірацца не было часу. Трэба было думаць, як уцякаць. Захапіўшы з сабой дакументы барона, тав. Кавалёў галопам ірвануўся да млына. Тры байцы ад яго не адставалі.

Гадзіны чатыры гаспадарнічаў тав. Кавалёў у Канстанцінаўны. Сто тысяч вінтовачных патронаў, тысяча снарадаў, чатырыста падвод абоза, восемсот палонных (тое што ўдалося сабраць)—такія былі трафеі, з якімі рушыў атрад тав. Кавалёва ў зваротны шлях.

Да вечара, стомленыя, але гордыя ўдачай і шчаслівыя (патронаў і снарадаў колькі здабылі!), дабраліся байцы атрада тав. Кавалёва з сваім непамерна грамодзкім абозам да сяла Спіцоўскага, да сваіх пазіцый. Усе вярнуліся, да аднаго. Карты Врангеля былі зблытаны. Задача выканана бліскуча.

Сам Врангель, як потым высветлілася, забіт не быў. Калі тав. Кавалёў кінуў у дом папа гранаты, барон забаўляўся ў спальні са сваёй «сястрой міласэрдыя». Пасля ўзрыву ён не прымусіў сябе доўга прасіць, выскачыў у карыдор, з дапамогай папа забраўся на падстрэшша, дзе «храбра», разам з бацюшкам, прасядзеў да ўходу тав. Кавалёва, а калі ў сяле некалькі сціхла, прэтэндэнт на прэстол расійскі босы і ў адных падштаніках уцякаў па марозу 18 вёрст да сваіх часцей, страціўшы на некаторы час увесь свой лоск і гонар.

Затое потым, калі ён ужо ў штанах і з салдатамі вярнуўся ў Канстанцінаўку, па яго асабістаму загаду былі павешаны трыццаць пяць ні ў чым не павінных сялян.

III

У жніўні 1918 года ў баі пад Краснадарам тав. Кавалёву перабілі правую нагу.

Лячыцца тав. Кавалёву не прышлося. Ён працягваў камандаваць часцю. Спачатку яго насілі на насілках, потым ён паяўляецца на полі бою на кастылях. Добра запомнілі яго белыя і з таго часу празвалі — «кульгавым».

Да студзеня 1919 года рана зажыла настолькі, што тав. Кавалёў мог ужо садзіцца на каня, але кастылі яму на ўсякі выпадак прывязвалі да сядла.

6 лютага 1919 года, у гарачым баі, тав. Кавалёў не заўважыў, як яго з невялікай жменькай байцоў акружыла да двухсот дзенікінцаў.

— Кульгавага — жыўцом!... Жыўцом лавіце! — асіплым, прапітым басам роў палкоўнік. Гэта выратавала.

«Кульгавага» жыўцом не злавілі. Ён прарваўся да сваіх праз кальцо ворагаў.

IV

Аб тым, як тав. Кавалёў, у студзені, без жылля, без баз забеспячэння, скрозь снежныя і пясчаныя бураны, у мароз, васемнаццаць сутак ішоў праз астраханскія пяскі, нельга напісаць толькі некалькі газетных радкоў.

Гэты паход, наогул, чакае яшчэ і свайго гісторыка і свайго мастака.

Ішоў Міхаіл Пракоф'евіч праз гэтыя пяскі разам з легендарным героем грамадзянскай вайны Іванам Антонавічам Качубеем. Называў Качубей Кавалёва ласкава і крыху грубавата — браток.

Ужо ў станіцы Прамыслоўка, уначы прышоў Качубей у хату, дзе спыніўся Кавалёў. Атрымаў Качубей асобае заданне і зараз павінен быў выступіць са сваёй часцю на Святы Крыж (цяпер Прыкумск).

— Ну, бывай, браток! Можа больш не ўбачымся. Дай штонебудзь для памяці.

Яны абмяняліся кінжаламі, развіталіся і больш ужо ніколі не сустрэліся.

Качубей загінуў.

Тав. Кавалёў і зараз хавае кінжал баявога друга.

V.

У лютым 1919 года сыпны тыф зваліў тав. Кавалёва. К таму-ж адкрылася рана. Па ліпень месяц праляжаў ён у Саратаўскім шпіталі, змагаючыся са смерцю.

Выздаравеў. Вышаў з шпіталя. Акруговая медыцынская камісія зволіла яго па стану здароўя з ваеннай службы. Але не такі быў час, каб мог прахладжацца дома Кавалёў. Ды і дома ў яго не было. Яшчэ ў жніўні 1918 года генерал Пакроўскі хацеў павесіць яго бацьку, але старык адмовіўся рушыцца з месца, вывеў з цярпення катаў і яны яго прыстрэлілі там-жа, у хаце на месцы. Маці ад белагвардзейскіх здзекаў, пабояў і гора звар'яцела і таксама неўзабаве памерла. Асталіся, як быццам, у жывых сястронка ды малодшы брат, але дзе іх шукаць?

Не было ў Кавалёва дома, не было сям'і, апрача Чырвонай Арміі, і прама з шпітальнага ложка ён перасаджваецца на кулямётную тачанку новафарміруемага ў Саратаве Кубанскага коннага дывізіёна.

На Уральскім фронце Міхаіл Пракоф'евіч разам з Васілием Івановічам Чапаевым пад Лбішчэнск хадзілі і пад Сахарную. На ўсё жыццё запомніўся яму пах смаленага мяса, які даносіў вецер з Сахарнай, падпаленай белымі перад адступленнем. Сто шэсцьдзесят чалавек палонных — чырвонаармейцаў спалілі тады белабандыты ў гумнах станіцы Сахарнай.

Імёны загінуўшых асталіся невядомымі.

Там-жа, у Сахарнай, пасля адыходу белых была знойдзена чырвонаармейцамі яшчэ вільготная страшная «рукавіца» — скура, садраная з рукі невядомага байца-чырвонаармейца. (Захоўваецца гэтая рукавіца зараз у Цэнтральным музеі РСЧА).

Праз чатыры гадзіны пасля смерці В. І. Чапаева прыбыў у Лбішчэнск дывізіён, якім камандаваў тав. Кавалёў. Доўга ён шукаў цела Чапая. Многа трупаў выцягнулі з ракі байцы, але не было сярод іх Васілія Іванавіча.

VI

9 верасня 1919 года зноў адкрыліся раны Кавалёва. Зноў эвакуацыя ў Самарскі шпіталь, але ўжо праз два тыдні мы бачым Міхаіла Пракоф'евіча на пасту камандзіра палка Таманскай дывізіі. Ад Царыцына да Сочы прайшоў ён са сваім палком, а пазней — з брыгадай.

Пад Мечэткай, пад Егорлыцкай змагаўся, Ціхарэцкую браў, пад Сочы, камандуючы брыгадай, прымусіў да здачы шасцідзесяцічатырохтысячную армію генерала Макарава.

У 1920 г. арганізаваў легендарны чырвоны дэсант супроць врангелеўскага дэсанта, за ліквідацыю якога ўзнагароджан ордэнам баявога Чырвонага Сцяга.

Увосень 1920 года паслалі тав. Кавалёва вучыцца ў Ваенную Акадэмію, але ўжо ў 1921 годзе ён быў кінут на ліквідацыю антонаўскага мяцежу ў Тамбоўскую губерню ў якасці камандзіра 20-га кавалерыйскага палка ВЧК і 14-й Асобнай кавалерыйскай брыгады.

Воляй Совецкага ўрада і партыі тав. Кавалёў пастаўлен на чале перадавога атрада нашай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Ён камандуе войскамі Беларускай Асобай Ваеннай Акругі.

* * *

Воляй партыі і асабіста таварыша Сталіна быў аддан загад Галоўнаму камандаванню Чырвонай Арміі перайсці граніцу і ўзяць пад сваю абарону жыццё і маёмасць адзінакроўных братоў —заходніх украінцаў і беларусаў. Пад камандаваннем Міхаіла Пракоф'евіча Кавалёва палкі Беларускай Асобай Ваеннай Акругі ў 5 гадзін раніцы 17 верасня 1939 года перайшлі граніцу былой польскай дзяржавы, магутным шквалам ачысцілі зямлю ад рэштак белапольскай арміі, прынеслі на сваіх сталёвых машынах вызваленне, свабоду, радасць і шчасце працоўным Заходняй Беларусі. У паспяховасці гэтых аперацый вялікая заслуга камандуючага Беларускай Асобай Ваеннай Акругі камандарма 2-га ранга тав. Кавалёва.

Працоўныя нашай абласці добра ведаюць тав. Кавалёва. Ён бываў на многіх прадпрыемствах, гутарыў з рабочымі, сялянамі, працоўнай інтэлігенцыяй.

Акруговая нарада ўпаўнаважаных 597 выбарчай акругі аднадушна падтрымала прапанову шматлікіх сходаў рабочых беластоцкіх прадпрыемстваў, чыгуначнікаў і сялян Заблудаўскага і Беластоцкага раёнаў аб вылучэнні кандыдатам у дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР тав. Кавалёва Міхаіла Пракоф'евіча.

Тав. Кавалёў — верны сын працоўнага народа. Галасуйце за тав. Кавалёва!

Ів. ШАПАВАЛАЎ.

СУСТРЭНЕМ ДЗЕНЬ ВЫБАРАЎ ВЫТВОРЧЫМІ ПЕРАМОГАМІ

ВЯСКОВЫ АГІТАТАР

Агітацыйную работу сярод сялян вёскі Дзякі, Валкавыскага раёна, Цітовіч Канстанцін Андрэевіч распачаў з моманту падрыхтоўкі да выбараў дэпутатаў Народнага Сабрання. Ён дэталёва азнаёміў выбаршчыкаў з вялікай Сталінскай Канстытуцыяй і выбарчым законам. Плённая работа Канстанціна Андрэевіча дала станоўчыя вынікі. Сяляне вёскі Дзякі ўсе, як адзін, прынялі актыўны ўдзел у галасаванні за кандыдата Народнага Сабрання Заходняй Беларусі.

Тав. Цітовіч не спыняў работу і пасля выбараў у Народнае Сабранне. Ён сістэматычна праводзіў гутаркі з сялянамі аб міжнародных падзеях, радасным і заможным жыцці працоўных краіны сацыялізма. Слухачоў асабліва цікавіла жыццё калгаснага сялянства. Агітатар падрабязна азнаёміў сялян з Сталінскім статутам сельскагаспадарчай арцелі, на канкрэтных прыкладах калгасаў расказаў ім, як вырасла соцыялістычная вёска і як культурна і заможна зажыло калгаснае сялянства.

Пасля апублікавання Ўказаў Прэзідыумаў Вярхоўнага Савета СССР і БССР аб выбарах у Вярхоўныя Советы тав. Цітовіч арганізаваў гуртох з 50 чалавек сялян. Рэгулярна, у вызначаны час, тут праходзяць заняткі па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах. У гуртку адбылося ўжо 7 заняткаў. Агітатар заўсёды добра падрыхтаван да заняткаў. Расказваючы аб вялікім сталінскім законе, ён выкарыстоўвае мастацкую літаратуру і прапагандысцкія матэрыялы журналаў і газет.

Разам з вывучэннем Канстытуцыі і выбарчага закона зараз тав. Цітовіч разгарнуў агітацыю за вылучаных кандыдатаў. Даходліван мовай ён расказвае выбаршчыкам аўтабіяграфіі вылучаных кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР і БССР.

Стаў большэвіцкай работай тав. Цітовіч забяспечыць стопрацантны ўдзел выбаршчыкаў у выбарах і галасаванні за кандыдатаў непераможнага сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Еўдакімаў.

ДА ЎСІХ ЧЫГУНАЧНІКАЎ БЕЛАСТОЦКАЙ ЧЫГУНКІ

(Пісьмо чыгуначнікаў Беларускай чыгункі)

Дарагія таварышы—чыгуначнікі Беластоцкай чыгункі! Разам з вамі мы перажываем велізарную радасць па поваду набліжэння дня выбараў дэпутатаў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР ад заходніх абласцей нашай ордэнаноснай рэспублікі.

Упершыню за доўгія годы вы, нашы браты Заходняй Беларусі, будзеце выбіраць сваіх прадстаўнікоў у соцыялістычны парламент на аснове самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі. Гэта нязмернае шчасце і гонар.

Вы, новыя совецкія грамадзяне, за кароткі тэрмін, які прайшоў з моманту вызвалення Заходняй Беларусі ад іга польскіх памешчыкаў і капіталістаў, заваявалі вялікія перамогі.

Ліквідавана беспрацоўе. Дзверы школ адкрыліся для соцень тысяч вашых дзяцей. Гаспадарамі ўсіх багаццяў стаў народ.

У прадстаячы дзень выбараў у вышэйшыя органы ўлады мы заклікаем вас галасаваць за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. Гэтым самым вы будзеце галасаваць за роскві вашага жыцця, за шчасце вашых дзяцей, за сваю любімую радзіму.

Мы хочам, дарагія таварышы, крыху падзяліцца з вамі, як мы выбіралі ў Вярхоўныя Советы.

Падрыхтоўка і правядзенне выбараў заўсёды былі для нас радасным святам. Незабываемым на ўсё жыццё астаўся ў нашай памяці дзень выбараў у Вярхоўны Совет СССР. Выбарчая кампанія, падрыхтоўка да выбараў былі магутнай усенароднай дэманстрацыяй адзінства і згуртаванасці совецкага народа, беззаветнай любві і адданасці соцыялістычнай радзіме.

Тысячы партыйных і непартыйных большэвікоў-агітатараў растлумачвалі масам Сталінскую Канстытуцыю, шырока знаёмілі з кандыдатамі сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Вялікае ўсенароднае лікаванне панавала ў дзень выбараў ва ўсіх кутках неабсяжнага Совецкага Саюза. Увесь народ аднадушна аддаў свае галасы за верных патрыётаў радзімы. Народ паслаў у совецкі парламент лепшых перадавых людзей краіны. У ліку выбраннікаў народа нямала выдатных работнікаў чыгуначнага транспарта. Сярод іх знатны машыніст Беларускай чыгункі Сямён Панцелеймонавіч Астапаў, узнагароджаны урадам ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Заўсёды да дня выбараў калектыў нашай чыгункі прыходзіў з выкананнем плана пагрузкі і выгрузкі. Мы звяртаемся да вас, таварышы чыгуначнікі, сустрэць радасны дзень выбараў — 24 сакавіка 1940 года — выдатнымі вытворчымі перамогамі, большэвіцкай адданай работай на ўсіх участках.

Няхай жыве самая дэмакратычная ў свеце Сталінская Канстытуцыя!

Няхай жыве Ўсесаюзная Комуністычная партыя!

Няхай жыве дарагі правадыр, бацька, друг і настаўнік вялікі, мудры Сталін!

Ад імені чыгуначнікаў Беларускай чыгункі пісьмо падпісалі знатныя людзі:

А. К. Лалаеў — машыніст дэпо Калінкавічы, узнагароджаны медалью за «Трудовое отличие».

В. А. Хаменка — начальнік станцыі Жлобін, узнагароджаны ордэнам Леніна.

Н. І. Булапая — работніца па рамонту пуці, узнагароджаная медалью «За трудовое отличие».

М. А. Фрыдкін — начальнік палітаддзела. Асіповіцкага аддзялення, узнагароджаны медалью «За трудовую доблесть».

І. С. Сімоненка — машыніст дэпо Жлобін.

В. Т. Осіпаў — нам. начальніка службы руху, узнагароджаны медалью «За трудовую доблесть».

І. С. Матвееў — каваль Магілеўскага вагоннага ўчастка, узнагароджаны ордэнам «Знак почета».

С. М. Астапаў — нам. начальніка гомельскага паравознага дэпо, узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, дэпутат Вярхоўнага Совета СССР.

КОМСАМОЛЬЦЫ ПРАЦУЮЦЬ СЯРОД ВЫБАРШЧЫКАЎ

Уся работа Гродненскага райкома комсамола перанесена цяпер у сяло, у вёску, непасрэдна да выбаршчыкаў. Комсамольцы працуюць у выбарчых камісіях, агітатарамі на ўчастках, у агіткалектывах.

Сіламі комсамольцаў і моладзі ў мястэчку Індуры, у вёсках Гожа, Вердзішкі і інш. арганізаваны чырвоныя куткі, хаты-чытальні, якія забяспечаны неабходнай выбарчай літаратурай. Арганізаваны гурткі па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і выбарчага закона.

Вялікім аўтарытэтам у сялян вёскі Канюхі, Індурскай воласці, карыстаецца нядаўна прыняты ў комсамол агітатар тав. Лашак. На занятклі яго гуртка па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет прыходзіць да 100 чалавек.

Малады агітатар т. Чыж працуе агітатарам у вёсцы Рыдзель. Ён на жывых прыкладах, фактах расказвае аднасельчанам аб дасягненнях, якіх дабіліся працоўныя заходніх абласцей Беларусі за час устанаўлення совецкай улады. Не так даўно ў г. Гродна была праведзена алімпіяда мастацкай самадзейнасці, і цяпер лепшыя калектывы накіраваны на абслугоўванне выбаршчыкаў.

У вёску Казлы выехаў харавы гуртох, у мястэчка Індуры — танцавальны. Гэтыя гурткі наведваюць самыя аддаленыя куткі раёна.

З удзельнікаў алімпіяды арганізавана таксама 2 агітбрыгады, якія карыстаюцца вялікай папулярнасцю сярод насельніцтва раёна. Агітбрыгада мае кінопераcоўку, выбарчую літаратуру і інш. У вёсках і сёлах праводзяцца даклады і гутаркі сярод выбаршчыкаў.

Я. Чэрнухін

Праф. Г. БОГАМОЛАЎ
Член Камітэта па справах геалогіі пры СНК СССР

ЗЯМЛЯ РАСКРЫВАЕ СВАЕ БАГАЦЦІ

У снежні 1939 года заходнія раёны Беларусі наведала брыгада спецыялістаў камітэта па справах геалогіі пры СНК СССР, якая знаёмілася з мінеральна - сыравіннымі рэсурсамі і становішчам геолага - пашуковых і геолага - разведчых работ.

Прыгнятаючы народ, мала клапоцячыся аб яго матэрыяльным добрабыце, бяздарныя правіцелі былой польскай дзяржавы не аддавалі амаль ніякай ўвагі вывучэнню карысных выкапняў і іншых багаццаў края.

За 20 год існавання польскай дзяржавы ні адзін з заходніх раёнаў Беларусі не быў усебакова даследван, не гледзячы на тое, што такія карысныя выкапні, як вугаль, нафта, металы, фасфарыты і рад будаўнічых матэрыялаў, прыходзілася сюды завозіць.

Адзін з буйнейшых у краі шклозавод «Нёман» амаль усю неабходную яму сыравіну атрымліваў з аддалёных раёнаў; соду — з Чэхаславакіі, вугаль — з Катовіц, пясок — з ваколіц Львова. Нават высокаякасны торф і то не атрымаў прызнання, як мясцовае паліва, не гледзячы на тое, што яго запасы тут, у Беларусі, складаюць некалькі сот мільёнаў кубаметраў.

Калі-б у панскай Польшчы ўмелі па-гаспадарску адносіцца да мясцовага паліва, то ніхто не стаў-бы ўжываць высокаякасны каменны вугаль для абпальвання цэглы, як гэта тут шырока практыкавалася.

Наогул прадпрыемствы па выпуску будаўнічых матэрыялаў — цэмента, цэглы, кафляў, вапны — працавалі па - драпежніцку. У гэтай справе кожны прадпрыемца дзейнічаў так, як яму ўдавалася ва ўмовах страшэннай канкурэнцыі. Калі мы паспрабавалі атрымаць у прадпрыемцаў геалагічныя даныя аб запасах мінеральнай сыравіны, то як правіла, іх не аказалася нават на буйных прадпрыемствах, працуючых ужо на працягу многіх год. Навошта было затрачваць сродкі на даследванне сыравіны, казалі нам, калі дзяшовыя вырабы ў нас і без таго ніхто не купляў.

Геалагічныя даследванні на тэрыторыі б. Заходняй Беларусі, калі яны і праводзіліся, то рэдка ішлі за дзяржаўны кошт. Толькі невялікі раён у ваколіцах Гродна быў абследван, так сказаць, у «інтарэсах дзяржавы». Было вядома, што тут знаходзяцца багатыя залежы высокаякаснай крэйды і фасфарытаў. Але аб навуковых рэзультатах гэтых работ да гэтага часу ніхто не ведае. Як відаць, матэрыялы даследванняў былі паложаны ў архіў таксамі, как і каштоўныя паведамленні мясцовага насельніцтва аб тых ці іншых знаходках карысных выкапняў.

Аб пошуках у раёне Гродна захавалася толькі многалетняя і бескарысная перапіска паміж Гродненскім прыродазнаўчым музеем і геалагічным Інстытутам у Варшаве. Спрэчка ішла аб тым, дзе павінны знаходзіцца астаткі маманта, знойдзеныя партыяй геолагаў.

У б. Заходняй Беларусі не аказалася ніводнага спецыяліста, працаваўшага ў галіне геалогіі або гідрагеалогіі. Нікога тут, апрача самога насельніцтва, не цікавіла наяўнасць значных залежаў балотных руд у Сталбцоўскім раёне, высокаякаснай крэйды ў ваколіцах Гродна, фасфарытаў і паваранай солі ў Вілейскім раёне, бурага вугалю ў Гродненскім і нафты ў Пінскім раёне.

У рэзультаце такой «геалагічнай службы» тэрыторыя б. Заходняй Беларусі ў геалагічных адносінах з'яўляецца амаль невывучанай.

У бліжэйшыя годы прыдзецца арганізаваць комплексную геалагічную здымку гэтых раёнаў з разведкай карысных выкапняў. У першую чаргу Камітэт па справах геалогіі пры СНК СССР мае намер звярнуць увагу на ацэнку запасаў мінеральнай сыравіны ў зоне працуючых прадпрыемстваў і разведаць некранутыя месцанараджэнні. У ваколіцах Гродна павінны быць дэтальна абследваны залежы крэйды і фасфарытаў, трэба канчаткова рашыць пытанне аб якасці і запасах торфу. У Сталбцоўскім і Пінскім раёнах павінны быць акантураны плошчы распаўсюджання балотных руд выяўлены іх запасы і якасць, праведзены гідрагеалагічныя работы для осушэння.

Надзвычайна цікавай з'яўляецца праблема нафтаносласці і соленоснасці дэвонскіх адкладанняў у басейнах рэк Прыпяці і Вілейкі, аб чым мы знаходзім кароткія ўказанні ў некаторых літаратурных крыніцах.

Пры намячаемых даследваннях нельга выпусціць з віду і высокалячэбныя мінеральныя воды ў раёне Друскенікі, маючыя ў сабе да 40 мг. брома і звыш 30.000 мг. паваранай солі ў адным літры. Гэтыя воды маглі-б быць скарыстаны не толькі для бальнеалагічных, але і для прамысловых мэт.

Ажыццяўленне вялікага плана геолага-разведчых работ дасць магчымасць атрымаць таксама ўсе неабходныя даныя аб прэсных падземных водах. Гэта мае велізарнае значэнне для водаснабжэння гарадоў, паляпшэння іх санітарнага становішча. Той факт, што з усіх гарадоў б. Заходняй Беларусі толькі Беласток і Слонім маюць прымітыўнае цэнтралізаванае водаснабжэнне за кошт выкарыстання падземных вод, гаворыць аб сур'ёзным значэнні работ, якія павінны быць праведзены ў гэтай галіне.

Совецкі народ, вызваліўшы працоўных б. Заходняй Беларусі ад прыгнёту польскіх памешчыкаў і паноў, не толькі стварыў умовы для правільнай арганізацыі шырокіх навуковых даследванняў мінеральных багаццяў края, але і іх скарыстання на карысць радзімы.



Надзежда Канстанцінаўна Крупская

Незабываемы вобраз

Прайшоў год з дня смерці Надзежды Канстанцінаўны Крупскай.

Пяцьдзесят год стаяла Надзежда Канстанцінаўна на баявым пасту, аддаючы ўсе сілы, усю энергію барацьбе за інтарэсы працоўных, за комунізм.

Надзежда Канстанцінаўна нарадзілася ў 1869 годзе ў Пецярбургу, у беднай сям'і інтэлігента. У 1890 годзе яна ўступіла ў марксісцкі гуртох. З 1891 года Крупская вядзе, як агітатар, работу ў рабочай вячэрняй школе на Шлісельбургскім тракце.

У 1893 годзе прыехаў у Пецярбург Ленін. У сумеснай рэволюцыйнай рабоце ўстанаўліваецца моцная дружба паміж Надзеждай Канстанцінаўнай і Леніным.

Надзежда Канстанцінаўна была бліжэйшым памочнікам Леніна ў цяжкія годы царскага падполля. Ва ўмовах нелегальнай работы яна займалася перапіскай літаратуры партыйным арганізацыям, перадачай дырэктыў Леніна на месцы, калі Ільіч знаходзіўся ў турме, у ссылцы, а потым у эміграцыі.

З 1901 года Надзежда Канстанцінаўна нязменны сакратар большэвіцкіх газет „Искра", „Вперед", „Пролетарий". На яе плечы лягла велізарная работа па сувязі з партыйнымі камітэтамі ў Расіі, сустрэчы і адпраўцы таварышоў на работу. Многа сіл палажыла Надзежда Канстанцінаўна ў час падрыхтоўкі II і III з'ездаў партыі.

Пасля Пражскай канферэнцыі 1912 года Ленін і Крупская пераехалі ў Кракаў, каб быць бліжэй да Расіі. Часцей сталі прыязджаць да Леніна таварышы з Расіі. Пры бліжэйшым удзеле Надзежды Канстанцінаўны наладзілася моцная сувязь з газетай „Правда" і з думскай фракцыяй, якімі кіраваў таварыш Сталін.

У годы імперыялістычнай вайны Ленін разгарнуў шырокую дзейнасць па згуртаванню рэволюцыйных сіл для барацьбы з імперыялізмам, па ператварэнню вайны імперыялістычнай у вайну грамадзянскую. Надзежда Канстанцінаўна энергічна дапамагала Уладзіміру Ільічу ў гэтай справе. Не гледзячы на вялікую занятасць, яна ў гэты-ж перыяд пад кіраўніцтвам Леніна пісала кнігу аб народнай асвеце. Вярнуўшыся разам з Леніным у Расію пасля Лютаўскай рэволюцыі 1917 г., Надзежда Канстанцінаўна вядзе работу ў сакратарыяце ЦК партыі, прымае актыўны ўдзел у Кастрычніцкім перавароце. Пасля Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі Надзежда Канстанцінаўна была назначана членам калегіі Наркамасветы і да апошніх дзён свайго жыцця займалася пытаннямі народнай асветы.

Тысячамі сувязей была звязана Надзежда Канстанцінаўна з шырокімі масамі працоўных. Народ выбраў яе дэпутатам Вярхоўнага Совета СССР. Яна атрымлівала мноства пісем з усіх канцоў Саюза, да яе зварочваліся па розных пытаннях работніцы і сялянкі, піонеры і школьнікі, настаўнікі і настаўніцы і для ўсіх яна знаходзіла патрэбныя словы, бо яна была сапраўдным ленінцам, чулым таварышом.

У дні вялікага народнага гора, калі памёр Уладзімір Ільіч, Надзежда Канстанцінаўна выступіла з мужнай прамовай і зноў паказала, што яна была дастойнай падругай вялікага Леніна. Яна гаварыла аб моцы жыцця Леніна, аб яго вялікай любві да народа і заклікала яшчэ вышэй падняць сцяг Леніна. Асабістае гора, асабістыя перажыванні Надзежды Канстанцінаўны адступілі перад смуткам партыі і народа.

Я бачыла Надзежду Канстанцінаўну пасля смерці Леніна і выразіла здзіўленне не мужнасці. Крупская сказала, што калі яна ўбачыла, наколькі вялікім быў смутак усёй партыі, усяго народа, яна неяк перастала адчуваць сваё гора ў адзіноцтве.

Надзежда Канстанцінаўна горача любіла сваю радзіму, свой народ, бязмежна радавалася кожнаму поспеху.

Крупская прайшла выдатнае жыццё большэвіка, поўнае творчай працы, рэволюцыйнай дзейнасці. Яна бачыла ў ажыццяўленні сталінскіх пяцігодак таржаство самых заветных дум Леніна. З якой радасцю яна гаварыла аб нашых поспехах, аб сваім шчасці быць членам большэвіцкай партыі, працаваць пад кіраўніцтвам вялікіх правадыроў пралетарыята, вучыцца ў выдатнага ленінца — вялікага Сталіна.

Незабываемы вобраз Надзежды Канстанцінаўны застанецца назаўсёды ў памяці працоўных усяго свету, як вобраз выдатнай большэвічкі, аддаўшай усё сваё жыццё справе комунізма.

М. Эссен.

ПРАМОВА ЧЭМБЕРЛЕНА

Лондан, 25 лютага. (ТАСС). Трэцяга дня англійскі прэм'ер Чэмбрелен выступіў у Бірмінгаме з прамовай.

Гаворачы аб інцыдэнце з германскім параходам «Альтмарк», які выклікаў, як вядома, абурэнне нарвежскага ўрада, Чэмберлен заявіў: «Нейтральная краіна, не гледзячы на істэрычныя крыкі немцаў, не павінна скардзіцца на тое, што Англія ў мэтах выратавання трохсот незаконнапалонных толькі тэхнічна парушыла нейтралітэт».

Спыняючыся на пытаннях аб «мэтах вайны» з Германіяй, Чэмберлен зноў падкрэсліў, што Англія дабіваецца аднаўлення Польшчы, Чэхаславакіі і звяржэнэня германскага ўрада.

НАРВЕЖСКАЯ НОТА АНГЛІІ

Лондан, 26 лютага. (ТАСС). Агенцтва Рэйтер паведамляе, што нарвежскі пасланнік у Англіі наведаў 24 лютага ў міністэрстве замежных спраў Галіфакса і ўручыў яму ад імені свайго ўрада новую ноту адносна інцыдэнта з германскім параходам «Альтмарк».

АНГЛА-ФРАНЦУЗСКІЯ ВАЕННЫЯ ЗАКУПКІ Ў ЗША

Нью-Йорк, 25 лютага. (ТАСС). Па паведамленню газеты «Нью-Йорк геральд трыбюн», прадстаўнікі англа-французскай закупачнай камісіі ў ЗША намераны скараціць закупкі, бо яны не задаволены патрабаваннямі амерыканскіх прамыслоўцаў.

Англія і Францыя дабіваюцца таго, каб іх заказы выконваліся ў першую чаргу. Урад ЗША лічыць гэта небяспечным для развіцця экспарта ў лаціна-амерыканскія краіны. На ўрад ЗША, падкрэслівае газета, не падзейнічала пагроза Англіі і Францыі перанесці свае заказы ў Італію. Паведамляюць, што ў цяперашні момант англа-французска-італьянскія гандлёвыя перагаворы спынены. Англія і Францыя намераны пакуль закупіць у ЗША ад 4 да 5 тыс. самалётаў (на працягу 18 месяцаў).

Кіраўнікі амерыканскай авіяцыйнай прамысловасці згодны паставіць Англіі і Францыі 8 тыс. самалётаў пры ўмове аплаты наяўнымі. Гэта сведчыць аб тым, што амерыканскія прамыслоўцы адмовіліся расшырыць крэдыты Англіі і Францыі.

Прадстаўнікі Англіі і Францыі ў ЗША ўсяляк імкнуцца ўхіліцца ад уплаты буйных падаткаў, якія амерыканскія авіяпрамыслоўцы ўключаюць у кошт самалётаў.

Забастоўка на авіяцыйным заводзе ў Англіі

Лондан, 25 лютага. (ТАСС). Як паведамляе газета «Дейлі уоркер», на адным з авіяцыйных заводаў Цэнтральнай Англіі аб'яўлена забастоўка, якой ахоплена амаль 2.000 чалавек. Рабочыя аб'явілі забастоўку ў знак пратэсту супроць нізкай заработнай платы, звышурочных работ і немагчымых умоў працы.

РУХ СУПРОЦЬ АКАЗАННЯ ДАПАМОГІ БЕЛАФІНЛЯНДЫІ

Нью-Йорк, 25 лютага. (ТАСС). Як перадае карэспандэнт газеты «Дэйлі уоркер» з Атланты (штат Георгія), негрыцянская газета «Атланта уорлд» паведамляе, што негрыцянскае насельніцтва Новага Орлеана аказвае супраціўленне спробам гувераўскага камітэта дапамогі бела-Фінляндыі збіраць сродкі сярод негрыцянскіх школьнікаў. Газета рашуча выступае супроць збору сродкаў для манергеймаўскай Фінляндыі.

Як паведамляла днямі газета «Дэйлі уоркер», школьныя чыноўнікі ў Лос-Анжэлосе аказваюць націск на дзяцей, каб яны ўносілі сродкі ў гувераўскі фонд дапамогі бела-Фінляндыі. Як указвае газета, кампанія гувераўскіх агентаў у рабочых раёнах Лос-Анджэлоса праваліласся.

ПАЛАЧ ФІНСКАГА НАРОДА

Фінская белагвардзейшчына ўпадае ў шаленства. Бачачы, як працоўны народ Фінляндыі ідзе да перамогі, белагвардзейскія афіцэры арганізуюць крывавую расправу над рабочымі і сялянамі. Масавыя арышты і расстрэлы мірных жыхароў становяцца галоўным сродкам супроць растучага абурэння мас. На чале белафінскай тэрарыстычнай банды стаіць генерал Манергейм. Хто ён — гэты палач фінскага народа?

Карл Густаў Манергейм носіць пышны цітул фельдмаршала. Сын буйнага памешчыка, Манергейм трыццаць год служыў верай і праўдай царскаму самадзяржаўю. Ва ўзнагароду за нізкапаклонніцтва і прэсмыкацельства перад царом ён атрымаў у камандавання адзін з кавалерыйскіх палкоў. У час вайны 1904 — 1905 гг. ён адседжваўся ў радах царскай чэлядзі, а ў сусветную вайну акалачваўся ў штабах.

Стаўбавы рускі дваранін, генерал «світы яго імператарскай вялікасці», «вялікага князя фінляндскага» і інш. Манергейм пасля разгрому буржуазна-памешчыцкага ладу ў Расіі хутка перакрасіўся ў члены шведскага рыцарскага ордэна дваранства». Буйны памешчык, мільянер, ён натуральна, адным з першых уцёк за мяжу. Яго сувязі з шведскімі. англійскімі, амерыканскімі банкірамі, іх давер'е забяспечылі яму месца ў радах буйных шпіёнаў імперыялістычных дзяржаў, у першую голаву ў англійскай разведцы.

Калі імперыялістычныя гаспадары паручылі Манергейму арганізацыю белай гвардыі ў Фінляндыі, прадажны генерал з незвычайным рвеннем узяўся за справу. Ён стварыў з белагвардзейскіх атрэб'яў гэту «гвардыю» ў вельмі кароткі тэрмін, баючыся, што гаспадары перадумаюць і пачнуць аказваць падтрымку зброяй, прыпасамі і грашыма якому-небудзь другому авантурысту. Але гаспадары не перадумалі. У антысовецкіх планах імперыялістаў задача ўдушэння фінляндскай рэвалюцыі рукамі Манергейма стаяла не на апошнім месцы. Манергейм паспеў зарэкамендаваць сябе перад Лонданам і Парыжам упаўне надзейным для выканання ролі душыцеля фінскага народа.

У англійскай «Ежегодной летописи» за 1919 год ёсць дакладная даведка аб Манергейме. Армія генерала Манергейма, — указвае «Летопись», — належыла да катэгорыі, як іх называюць, белагвардзейскіх арміі. Яго белагвардзейцы рэкруціраваліся выключна з асяроддзя буржуазіі. Іншымі словамі, гэта была па сутнасці класавая армія, палітычная армія». Гэты класавы характар манергеймаўскай «арміі» быў даказан на справе. З дзікай ненавісцю і злосцю кінулася банда манергеймаўцаў на падаўленне фінляндскай рэвалюцыі ў 1918 годзе. Фінскі народ быў патоплен у крыві. Ад помсты буржуазіі загінула тады каля 40.000 рабочых і сялян. Толькі ў 1918 годзе было расстраляна 15.817 чалавек, кінута ў турмы 90.000 чалавек. Перад тым, як забіць свае афяры, бандыты прымушалі саміх смертнікаў капаць для сябе магілы. Разам з расстралянымі закапвалі жыўём раненых. Выкалвалі вочы, адразалі вушы, гвалтавалі перад умярцвеннем жанчын. Знішчалі людзей гранатамі і кулямётным агнём. Пасля разгрому рэвалюцыі 145 надзвычайных судоў «па закону» прыгаварылі 66.789 чалавек да заключэння ў катаржныя турмы агульным тэрмінам на 300.000 год. Былі вынесены сотні смяротных прыгавораў.

Пасля такой крывавай расправы Манергейм паехаў з дакладам у Лондан. Там 7 кастрычніка 1919 года ён у гутарцы з прадстаўніком газеты «Таймс» ва ўсеўслышанне заявіў, што Фінляндыя «па першаму знаку заходніх дзяржаў» гатова выступіць у паход на Петраград. У студзені 1920 года Манергейм, па сведчанню «Таймс», атрымаў абяцанне ваеннай і фінансавай падтрымкі (з боку Англіі і Францыі) у справе арганізацыі мяркаваўшагася наступлення (супроць совецкіх рэспублік) на фронце, які, як мяркавалася павінен быў працягнуцца ад Мурманска да Чорнага мора». Пры гэтай дапамозе Манергейм не раз арганізоўваў антысовецкія паходы, канчаўшыеся, праўда, даволі сумна для стаўленіка англа-французскага імперыялізма.

Выжываючы з розуму генерал і на восьмым дзесятку не адвязваўся ад сваіх навязчывых брэдней. Ён быў заўсёды адным з тых заправіл бела-Фінляндыі, якія «усёй сваёй палітыкай паказалі, што яны гатовы прадаць інтарэсы самастойнасці і безапаснасці Фінляндыі імперыялістам замежных дзяржаў, гатовы за прылічную цану служыць іх антысовецкім ваенным дамаганням» («Зварот ЦК кампартыі Фінляндыі» 30/XI - 39 г.). Гэта ён разам з Каяндэрам, Эрко, Руці і іншымі прахадзімцамі пачаў па ўказцы з Лондана злачынную вайну супроць Совецкага Саюза.

Працоўныя Фінляндыі з нянавісцю і амярзеннем вымаўляюць імя белагвардзейскага генерала Манергейма. І недалёк той час, калі вярхоўны палач фінскага народа разам з усімі сваімі падручнымі будзе змецен з твару фінскай зямлі.

С. ФЕДОТАЎ.

СУСТРЭЧА УЭЛЕСА З ЧЫЯНО І МУСАЛІНІ

Нью-Йорк, 26 лютага. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Асашыэйтэд прэсс з Рыма, Уэлес гутарыў з італьянскім міністрам замежных спраў Чыяно. Пасля гэтага Чыяно зрабіў даклад Мусаліні па поваду сваёй гутаркі У 16 гадзін па грынвіцкаму часу Уэлес быў прыняты Мусаліні. Уэлеса суправаждаў пасол ЗША ў Рыме Філіпс,

Агенцтва паведамляе, што заўтра ноччу Уэлес выязджае ў Берлін, пры гэтым ён не мае намеру застанавіцца ў Швейцарыі.



На здымку: Агітатар — ткач беластоцкай тэкстыльнай фабрыкі № 23 І. Я. Валкавыскі гутарыць з сям'ёй рабочага С. Л. Еліна.

(Фота-клішэ ТАСС).

ПА ГОРАДУ І ОБЛАСЦІ

БЯЗМЕЖНАЯ ЛЮБОЎ ДА ПРАВАДЫРА

Днямі сялянкі-бядначкі з вёскі Трэстовічане, Крынскага раёна, Анна Канецкая і Марыя Магадыр звярнуліся ў Крынкаўскі райком КП(б)Б з просьбай прыняць ад іх падарунак і пісьмо правадыру народаў таварышу Сталіну.

У падарунак таварышу Сталіну сялянкі выткалі кавёр, а ў пісьме яны выражаюць сваю бязмежную любоў да правадыра народаў, таварыша Сталіна, які вядзе краіну да шчаслівага жыцця.

АГЛЯД МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

Днямі адбыўся агляд мастацкай самадзейнасці Беластоцкага аддзялення чыгункі.

У аглядзе прымалі ўдзел 11 калектываў і 26 чалавек з асобнымі нумарамі; агульны лік удзельнікаў — 232 чалавекі.

Агляд прайшоў з вялікай актыўнасцю ўдзельнікаў.

Лепшыя рэзультаты паказаў клуб чыгуначнікаў ст. Лапы, калектывы якога сур'ёзна падрыхтавалі рэпертуар і мастацка яго апрацавалі. Нядрэнна арганізаваў таксама работу клуб у Старосельцах, дзе існуюць вялікія калектывы — харавы ў 40 чалавек, духавы — 20 чалавек і струнны— 27 чалавек.

Асаблівай увагай карысталася на аглядзе 6 - гадовая дачка рабочага токара ст. Лапы тав. Гіцэвіч, якая за дэкламацыю прэміравана каштоўнымі падарункамі.

СХОД ГРАМАДСКІХ САНУПАЎНАВАЖАНЫХ

Дзяржаўная Санінспекцыя арганізавала ў гор. Беластоку сець грамадскіх санупаўнаважаных.

Днямі ў памяшканні дзіцяга шпіталя адбыўся сход першай групы грамадскіх санупаўнаважаных, на якім доктар Какотак зрабіў інструкцыйны даклад. Пасля гэтага санупаўнаважаныя былі накіраваны на работу па сваіх раёнах.

СОДА І ШЭРСЦЬ ДЛЯ ТЭКСТЫЛЬНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Тэкстыльным трэстам атрымана 15 тон соды для тэкстыльных прадпрыемстваў.

Прыбылі таксама 3 вагоны шэрсці для тэкстыльнай прамысловасці.

БУДАЎНІЦТВА Ў НОВЫМ РАЁННЫМ ЦЭНТРЫ

У цэнтры новага Заблудаўскага раёна намечана пабудаваць у бліжэйшы час новы кіно-тэатр. У былым доме фабрыканта будзе адкрыта да дня Чырвонай Арміі гасцініца. К гэтаму-ж дню ў былым маёнтку Дабрынёўка ў паўтара кілометрах ад раённага цэнтра будзе адкрыта бальніца на 35 ложкаў.

НОВЫЯ ФІЛЬМЫ ДЛЯ БЕЛАСТОЦКАЙ ОБЛАСЦІ

Обласным аддзелам Главкінопракат атрыманы днямі для выпуска на экраны кіно-тэатраў Беластоцкай обласці новые кіно-карціны: «Вялікае жыццё» і «Падкідыш».

Ў сакавіку для папаўнення карціннага фонда Беластоцкага аддзела — прыбудуць фільмы «Доктар Калюжны», «Сцепан Разін», «Аэроград», «Дачка радзімы» і рад іншых.

Паведамленне

27 лютага ў 20 гадзін (па маск. часу) у Доме партыйнай асветы (вул. Л. Толстога, 9) адбудзецца лекцыя для інтэлігенцыі горада на тэму «Стварэнне расійскай соцыял-дэмакратычнай партыі» (другая лекцыя).

Лектар тав. ГРЭКАЎ.

Адказны рэдактар **Б. М. Зельман**

Дирекция и коллектив работников пединститута выражают соболезнование бухгалтеру пединститута тов. РЫБАКОВСКОМУ по поводу смерти дочки **СОФИИ ДОМБРОВСКОЙ**

ОБЯЗАТЕЛЬНОЕ ПОСТАНОВЛЕНИЕ ГОРОДСКОГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА ГОР. БЕЛОСТОКА

Городской исполнительный комитет **постанавляет:**

1. Для оперативного руководства по борьбе с наводнением создать городскую комиссию в составе следующих тт. : Сенкевича, Беренштейна, Орлова, Розика, Козлова и Северина.

Установить место нахождения комиссии: горисполком, тел. № 24.

2. Предложить комиссии установить круглосуточное дежурство членов комиссии.

3. Организовать в гор. Белостоке 8 районных троек по борьбе с наводнением, с охватом следующих зон их деятельности.

1-Я РАЙОННАЯ ТРОЙКА.

От пивоварного завода до фанерной фабрики, по левой стороне реки Белой, включая одно предприятие — пивоварный завод. Начальником тройки утвердить тов. Калиновского, членами — тт. Якубовского А. М. и Подымако. Адрес тройки: пивзавод. тел. № 98.

2-Я РАЙОННАЯ ТРОЙКА.

От фанерной фабрики, до моста под шоссе под Кривой, включая предприятие — фанерную фабрику. Начальником тройки утвердить тов. Лукашевича, членами — тт. Финкеля И. Б. и Добчинского. Адрес тройки: фанерная фабрика, тел. 6-31.

3-Я РАЙОННАЯ ТРОЙКА.

От моста по шоссе под Кривой до моста по Коминтерновской ул., включая предприятия по правой стороне реки: 1) текстильную фабрику № 15. 2) текстильную фабрику комбината № 2, 3) текстильный комбинат № 13, 4) гаражи обкома, 5) городскую поликлинику, 6) обойную фабрику. Начальником тройки утвердить т. Вейланда, членами — тт. Юндова М. А. и Фадеева. Адрес тройки: 2-й тонкосуконный комбинат, Красноармейская, 72, тел. 45; адрес Юндова: ул. Карла Маркса 2а, тел. 1-97.

4-Я РАЙОННАЯ ТРОЙКА.

От моста по ул. Коминтерновской до моста по ул. Ленинской, правая сторона реки, включая следующие предприятия:

1) текстильную фабрику комбината № 4, 2) Госбанк, 3) Почту, 4) гимназию, 5) текстильную фабрику комбината № 2. Начальником тройки утвердить т. Зингерского, членами — тт. Дайненко И. С. и Завалея. Адрес тройки: текстильная фабрика № 14, тел. 7-07.

5-Я РАЙОННАЯ ТРОЙКА.

От моста по ул. Ленинской до полотна жел. дор., правая сторона реки, включая следующие предприятия:

1) текстильную фабрику № 17, 2) текстильную вторую фабрику № 17, 3) текстильную фабрику № 25, 4) гимназию, 5) текстильную фабрику комбината № 1, 6) кожевенный завод, 7) механический завод, 8) базу Белкожснабсбыт, 9) конвертную фабрику, 10) текстильную фабрику комбината № 1, 11) кино-трест (текстильный комбинат), 12) текстильную фабрику комбината № 1, 13) текстильную фабрику комбината № 1. Начальником тройки утвердить тов. Рынкевича, членами — тт. Попеля Н. П. и Богомолова. Адрес тройки: ул. Карла Маркса, д. № 26, кв. 2, тел. фабрики № 27 4-86.

6-Я РАЙОННАЯ ТРОЙКА.

От полотна жел. дороги по ул. Ленинской, левая сторона реки, включая следующие предприятия:

1) насосную станцию, 2) механический завод, 3) красильню текстильного комбината № 1, 4) текстильную фабрику комбината № 1, 5) текстильную фабрику комбината № 1, 6) текстильную фабрику комбината № 1, 7) текстильную фабрику комбината № 1, 8) текстильную фабрику комбината № 1, 9) химтруд на участке Беркицкого, 10) фабрику красок, 11) лесной склад. Начальником тройки утвердить т. Мальцберга, членами — тт. Романчука и Вольфсона. Адрес тройки: 1-й текстильный комбинат.

7-Я РАЙОННАЯ ТРОЙКА.

От моста по Ленинской улице до моста по ул. Коминтерновской, по левой стороне реки, включая следующие предприятия:

1) городскую баню, 2) школу (рядом с автомастерской), 3) здание мельницы крупы (бывш. текстильной фабрики), 4) театр «Палас», 5) гостиницу № 1, 6) гор. театр, 7) электростанцию, 8) гимназию, 9) здание б. казначейства и б. окружного суда. Начальником тройки утвердить т. Водиславского, членами — тт. Орлова и Черняк. Адрес тройки: городская электростанция № 1, тел. 12-60.

8-Я РАЙОННАЯ ТРОЙКА.

От моста по ул. Коминтерновской до моста по шоссе под Кривой, левая сторона реки, включая предприятия: 1) текстильную фабрику № 23, 2) сгоревшее здание текстильной фабрики № 28, 3) кислородный завод, 4) текстильную фабрику комбината № 2, 5) изразцовый завод, 6) кожевенный завод. Начальником тройки утвердить т. Таборицкого, членами — тт. Моторина Ю. Г. Адрес тройки: изразцовый завод, тел. 7-18; тел. т. Моторина 5-63.

4. Мобилизовать и прикрепить к каждой районной тройке по 2 грузовых автомашины. Машины должны быть в полной исправности, заправлены, иметь по 2 человека грузчиков.

Представленный список грузовых автомашин на время паводок для каждой тройки утвердить.

Обязать руководителей учреждений, предприятий и организаций — представлять мобилизованные автомашины по первому требованию районных троек.

5. Обязать горздрав при всех районных тройках организовать пункты медицинской помощи.

ПРИМЕЧАНИЕ: Вопросы, отмеченные в пп. 5 и 6 приводятся в исполнение с разрешения городской комиссии.

6. Обязать директора электростанции № 1 т. Черняк немедленно огородить турбину станции, подготовить насосы для откачивания воды и произвести необходимые работы по предупреждению от затопления станции.

7. Обязать руководителей предприятий, учреждений, организаций и артелей: пивоварный завод «Дойлиды», фанерной фабрики, текстильной фабрики № 15, текстильной фабрики комбината № 2, текстильного комбината № 13, гаражей обкома, городской поликлиники, обойной фабрики, текстильной фабрики комбината № 4, банка, почты, гимназии, текстильной фабрики комбината № 2, текстильной фабрики № 17, второй текстильной фабрики № 17, текстильной фабрики № 25, гимназии около моста по ул. Пролетарской, гимназии по ул. Юровецкой, текстильной фабрики комбината № 1, текстильной фабрики комбината № 1, кожевенного завода, механического завода.

Одновременно обязать всех домовладельцев немедленно приступить к очистке снега с крыш всех зданий.

Под личную ответственность всех руководителей предприятий, организаций, учреждений, артелей, немедленно принять необходимые меры по охране материалов, оборудования и всего имущества при могущем быть наводнении, а также подготовить работу своих предприятий во время наводнения и организовать тройки по отдельным об'ектам.

Свою работу на об'ектах тройки проводят в соответствии с указаниями районных троек и городской комиссии по борьбе с наводнением.

8. Все предприятия, учреждения, организации по требованию городской комиссии по борьбе с наводнением обязаны освободить от работы дружинников добровольных пожарных дружин, а также авто и гужевой транспорт, направляя таковой по указанию районных троек.

9. Выплата дружинникам зарплаты за время, потраченное на борьбу с наводнением, производится предприятиями и учреждениями, где они работают.

10. Все распоряжения городской комиссии по борьбе с наводнением являются обязательными для исполнения всеми без исключения предприятиями, учреждениями, организациями и частными лицами.

11. Виновные в нарушении данного обязательного постановления подвергаются административному взысканию, т. е. штрафу до 100 рублей или принудительным работам до 14 дней.

12. Надзор за исполнением этого постановления возлагается на РК. Милицию.

13. Постановление входит в силу со дня его опубликования и действует до полной ликвидации последствий наводнения.

Председатель городского исполнительного комитета гор. Белостока **СЕНКЕВИЧ.**

Ответственный секретарь городского исполнительного комитета гор. Белостока **ОКУНЬ.**

г. Белосток, 24 февраля 1940 г.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнага рэдактара—22; партаддзела і сакратарыята—23; сельскагаспадарчага, культурнага, літаратуры і мастацтва, школьнага і інфармацыйнага аддзелаў—17.62 выдавецтва і аддзел аб'яў—16-10; друкарня і начная рэдакцыя 5.21. Падпіску на газету прымае Саюздрук тэл. 5.14.

Упаўнаважаны абліта № 217.

1-я дзяржаўная друкарня ў г. Беластоку.